**Педагагічная лабараторыя "РЭЙ"**
**рэспубліканскага грамадскага аб'яднання**
**"Таварыства беларускай школы"**

# ШКОЛЬНАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРОТКІ ДАВЕДНІК
ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ І БАЦЬКОЎ

Мінск 2005

Укладальнікі: Максім Чарняўскі, Алеся Чарняўская

Рэцэнзенты: начальнік вучэбна-метадычнага аддзела па арганізацыі павышэння кваліфікацыі класных кіраўнікоў установы адукацыі "Мінскі дзяржаўны абласны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў" В.С. Лапаткіна;
загадчык лабараторыяй выхавання школьнікаў Нацыянальнага інстытута адукацыі Б.Г. Закаблукоўскі

Аўтары выказваюць вялікую падзяку Фонду "Адукацыя для Дэмакратыі" за шматгадовае плённае супрацоўніцтва

**© Педагагічная лабараторыя "РЭЙ"**
**© Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай школы"**



Наклад 250 асобнікаў

Змест:

**Уступнае слова** ........ **3**
**Школа – яе мэты і задачы** ........ **4**
**Удзельнікі адукацыйнага працэсу** ........ **4**
Правы настаўнікаў ........ 4
Абавязкі настаўнікаў ........ 5
Правы бацькоў ........ 5
Абавязкі бацькоў ........ 6
Правы вучняў ........ 6
Абавязкі вучняў ........ 7
**Хто кіруе школай** ........ **8**
Дырэктар школы і яго намеснікі ........ 9
Школьная канферэнцыя ........ 11
Савет школы ........ 11
Педсавет ........ 14
Бацькоўскі камітэт ........ 16
Вучнёўскае самакіраванне ........ 20
Апякунскі савет ........ 20
**Статут установы адукацыі** ........ **24**
**Прагнозы на будучыню** ........ **27**
**Скарачэнні:** ........ **29**



# Уступнае слова

Добры дзень, шаноўны Дарослы!

У Вашых руках знаходзіцца першае выданне інфармацыйнага дапаможніка па самакіраванню ў школе. Ён напісаны для тых, у каго у адукацыйнай установе вучацца альбо будуць вучыцца дзеці, і для тых, хто ў ёй працуе або збіраецца працаваць.

На першы погляд усё проста: школа – гэта месца, куды бацькі адпраўляюць дзяцей, каб праз дзесяць з невялічкім гадоў атрымаць такіх жа адукаваных і выхаваных як яны самі або нават лепшых. Толькі вось, калі дарослыя шчыльней сутыкаюцца са школай, то са здзіўленнем заўважаюць, што ўсё нашмат больш складана, чым у іх час. Іншыя дарослыя, якія там працуюць, маюць свой пункт гледжання на сваю ўстанову, на месца ў яе жыцці тых жа бацькоў, якія прывялі сюды сваіх дзетак. Гэтыя думкі не тое каб былі дыяметральна супрацьлеглыя, але часам дастаткова істотна разыходзяцца.

Таму, калі два бакі – бацькі і настаўнікі – сыходзяцца ў спрэчках адносна таго, што такое школа, для чаго яна існуе і хто за што ў ёй адказны, суразмоўцам нярэдка не хапае мінімальных ведаў пра існуючае заканадаўства, якое абумоўлівае дзейнасць адукацыйна- выхаваўчай установы. Дзеля вырашэння гэтага недахопу інфармацыі ўкладальнікамі і быў зроблены аналіз адпаведных нарматыўных прававых дакументаў.

# Школа – яе мэты і задачы

Для пачатку разгледзім мэты і задачы школы.

Паводле існуючага заканадаўства асноўнай мэтай установы сярэдняй адукацыі з'яўляецца[1]:

- забеспячэнне духоўнага і фізічнага станаўлення асобы;
- падрыхтоўка маладога пакалення да паўнавартаснага жыцця ў грамадстве;
- выхаванне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, павагі да правоў і свабод чалавека, любві да Радзімы, сям'і;
- авалодванне дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь;
- авалодванне навыкамі разумовай і фізічнай працы;
- фарміраванне адукаванай, сацыяльна, духоўна і маральна сталай, творчай асобы;
- прывіццё навыкаў здаровага ладу жыцця.

Акрамя таго, мэты і задачы канкрэтнай школы павінны быць зафіксаваны ў статуце дадзенай навучальнай установы[2]. Забягаючы наперад, адзначу, што дадзены дакумент прымаецца школьнай канферэнцыяй, прадстаўленай настаўнікамі, бацькамі і вучнямі, і што менавіта тут могуць быць агучаны вашы жаданні і чаканні ад вашай канкрэтнай школы.

# Удзельнікі адукацыйнага працэсу

Вось мы і назвалі ўдзельнікаў навучальна–выхаваўчага працэсу ў агульнаадукацыйнай школе:

- вучні («навучэнцы і выхаванцы»),
- бацькі («законныя прадстаўнікі дзяцей»),
- настаўнікі («педагагічныя работнікі»).

У кожнай з гэтых групаў ёсць правы і абавязкі. Яны распісаныя ў трох дакументах – Законе Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі", Палажэнні аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі і статуце школы.кк

***Настаўнік мае права[3]:***

- на абарону свайго прафесійнага гонару і годнасці;
- на забеспячэнне ўмоваў для здзяйснення прафесійнай дзейнасці;

[1] Арт. 22 "Аб адукацыі"; П. 7 "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі" – *глядзі спіс скарачэнняў на апошняй старонцы*

[2] Арт. 19 "Аб адукацыі"; П. 2.3.1. "Аб статуце школы"

[3] Арт. 52 "Аб адукацыі", П. 76 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"



# Скарачэнні:

| | |
|---|---|
| Канвенцыя ААН "Аб правах дзіцяці" | – Канвенцыя |
| Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь | – Канстытуцыя РБ |
| Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" | – "Аб адукацыі" |
| Закон Рэспублікі Беларусь "Аб правах дзіцяці" | – "Аб правах" |
| Палажэнне аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі | – "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі" |
| Прыкладнае палажэнне аб агульнаадукацыйнай школе | – Прыкладнае палажэнне |
| Прыкладнае палажэнне аб статуце адукацыйнай і выхаваўчай установы сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь | – "Аб статуце школы" |
| Прыкладнае палажэнне аб савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь | – "Аб савеце" |
| Палажэнне аб педагагічным савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь | – "Аб педсавеце" |
| Палажэнне аб бацькоўскім камітэце агульнаадукацыйнай школы | – "Аб бацькоўскім" |
| Палажэнне аб апякунскім савеце ўстановы адукацыі | – "Апякунскі" |
| Арт. | – Артыкул |
| П. | – Пункт |
| Ч. | – Частка |

канферэнцыя[43]... У перыяд паміж канферэнцыямі вышэйшым органам самакіравання выступае савет школы[44]..." з зафіксаваным у Палажэнні аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі: "Кіраванне ўстановай … будуецца на прынцыпах ***адзінаначалля і самакіравання.*** Ва ўстанове ***могуць*** ствараціца органы самакіравання: савет, апякунскі савет… Ва ўстанове са згоды законных прадстаўнікоў вучняў ***могуць*** стварацца бацькоўскія камітэты[45]...". Як бачым, калі Прыкладнае палажэнне проста адзначала, якія ёсць органы школьнага самакіравання, то ў новым Палажэнні словам "***могуць"*** пакідаецца мажлівасць увогуле не ўводзіць у школе адпаведныя органы. Добра, што Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" у Арт. 44 адназначна сцвярджае: "Ва ўстановах адукацыі ствараюцца органы самакіравання (саветы, апякунскія саветы). Тым не менш тэрмін "канферэнцыя" знік з нарматыўных актаў, а пра адносіны да апякунскіх саветаў як органа самакіравання школы мы ўжо адзначалі вышэй.

У праекце Закона Рэспублікі Беларусь "Аб агульнай сярэдняй адукацыі", які можна знайсці ў сетцы Інтэрнэт, сітуацыя пакінутая без зменаў: "Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, ствараюцца органы самакіравання (саветы ўстановы, апякунскія саветы, бацькоўскія камітэты). Кампетэнцыя органаў самакіравання і парадак іх фармавання вызначаюцца ў адпаведнасці са статутам установы і адпаведнымі палажэннямі аб органах самакіравання, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь" (Арт. 17.4). Як бачым, тут на ўзроўні дзяржаўнага закона ўпершыню побач з саветам школы і апякунскім саветам пастаўлены бацькоўскія саветы. Тым не менш, прынцып "***адзінаначалля і самакіравання*** " пакінуты (Арт. 19.1). А ў артыкуле 33, які разглядае правы і абавязкі навучэнцаў, няма нават згадкі на іх права ўдзельнічаць не тое што ў школьным самакіраванні, але нават у вучнёўскім.

Абсалютна іначай выглядаюць напрацоўкі будучага Кодэкса Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі". У ім будуць раскрытыя формы самакіравання ва ўстанове адукацыі, адзначана сутнасць самакіравання ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. Будуць падрабязна разгледжаны органы педагагічнага самакіравання (педагагічны савет, метадычны савет, метадычныя аб'яднанні), самакіравання навучэнцаў (са структурай), самакіравання бацькоў (бацькоўскі сход, бацькоўская канферэнцыя, бацькоўскі камітэт), школьнага самакіравання (сукіравання педагогаў, навучэнцаў, бацькоў – савет, а таксама зноў юрыдычна зафіксаваная агульнашкольная канферэнцыя як вышэйшы орган самакіравання ўстановы адукацыі).

[43] П. 29 "Прыкладнае палажэнне"
[44] П. 30 "Прыкладнае палажэнне"
[45] П. 31 "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"



- на творчую ініцыятыву, свабоду выбару методык навучання, выхавання, вучэбных дапаможнікаў і сродкаў навучання;
- на ўдзел у кіраванні ўстановай адукацыі;
- на штомесячную кампенсацыю выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры;
- на іншыя сацыяльныя гарантыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;
- на матэрыяльнае і маральнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

### *Абавязкі настаўнікаў*[4]

Абавязкі педагагічных работнікаў вызначаюцца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі", іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, статутам установы адукацыі, службовымі абавязкамі. Службовыя абавязкі распрацоўваюцца і зацвярджаюцца дырэктарам установы на аснове кваліфікацыйных характарыстык.

- Забараняецца выкарыстоўваць навучальны працэс у палітычных мэтах або для пабуджэння навучэнцаў (выхаванцаў) да дзеянняў, што супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь.
- Педагагічныя работнікі нясуць адказнасць за арганізацыю навучальнага працэсу ва ўстановах адукацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

Працоўныя адносіны работнікаў ва ўстанове рэгулююцца працоўнай дамовай (кантрактам) у адпаведнасці з заканадаўствам аб працы Рэспублікі Беларусь[5].

### *Бацькі маюць права*[6]*:*

- выбіраць установу адукацыі і формы атрымання адукацыі дзіцём;
- прымаць удзел у працы органаў самакіравання установы адукацыі, у якой навучаецца іх дзіця;
- даць дзіцяці агульную пачатковую, агульную базавую, агульную сярэднюю адукацыю ў сям'і пры наяўнасці ў ёй адпаведных умоваў і па ўзгадненню з упраўленнямі і аддзеламі адукацыі мясцовых выканаўчых і распараджальных органаў, захоўваючы магчымасць на любым этапе навучання працягнуць яго адукацыю ва ўстанове адукацыі ў адпаведнасці з вынікамі атэстацыі;
- прадстаўляць інтарэсы дзяцей ва ўстановах адукацыі;

[4] Арт. 52 "Аб адукацыі", П. 75 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[5] П. 75. . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[6] Арт. 51 "Аб адукацыі", П. 78 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"

- атрымліваць інфармацыю пра ўсе віды абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных і інш.) дзіцяці, якія праводзяцца ва ўстановах адукацыі;
- патрабаваць выключэння з вучэбна-выхаваўчага працэсу прадметаў (факультатываў, курсаў па выбару, гурткоў, секцый і інш.) або асобных тэм, вывучэнне якіх негатыўна ўплывае на фізічнае і маральнае здароўе дзіцяці.

### *Абавязкі бацькоў[7]:*

- забяспечыць атрыманне дзіцём агульнай базавай адукацыі;
- стварыць неабходныя ўмовы для паўнавартаснага развіцця дзіцяці;
- паважаць годнасць дзіцяці.

Законныя прадстаўнікі дзяцей нясуць адказнасць за выхаванне дзіцяці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### *Вучні маюць права[8]:*

- на атрыманне бясплатнай адукацыі ў аб'ёме, вызначаным патрабаваннямі адукацыйных стандартаў;
- на выбар профілю навучання і яго зместу ў межах школьнага кампанента;
- на навучанне самастойна (у сям'і), а таксама на навучанне па індывідуальным плане;
- на вольнае наведванне мерапрыемстваў, якія праводзяцца ўстановамі адукацыі для навучэнцаў і выхаванцаў па-за вучэбным планам;
- на бясплатнае карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэк, вучэбнай, вытворчай, навучнай і культурна-спартыўнай базай установы адукацыі;
- на карыстанне ў парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь, падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, іншай літаратурай, неабходнай для атрымання адукацыі;
- на прававую і сацыяльную абароненасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- на ахову жыцця і здароўя ў працэсе навучання;
- на павагу сваёй годнасці;
- на дапамогу педагагічных работнікаў у авалоданні ведамі;
- на заахвочванне і ўзнагароджванне за поспехі ў вучобе;
- на адкрытую ацэнку сваіх ведаў, своечасовае паведамленне аб тэрмінах правядзення кантрольных работ, падагульняючых тэстаў, экзаменаў;

[7] Арт. 51 "Аб адукацыі", П. 78 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[8] Арт. 48 "Аб адукацыі", П. 77.1. "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"



(раённым, гарадскім, абласным) рэгіструюць статуты ў адпаведных органах адукацыі (раённых, гарадскіх, абласных).

Статуты дзіцячых інтэрнатных устаноў і спецыяльных школ, якія падпарадкоўваюцца мясцовым раённым (гарадскім) Саветам народных дэпутатаў, могуць рэгістравацца ў абласных (Мінскім гарадскім) упраўленнях адукацыі па дамоўленасці паміж імі.

…

3.6. Рашэнне аб рэгістрацыі статута прымаецца на працягу 30 дзён з моманту падачы заявы (звароту).

3.7. Парадак рэгістрацыі статутаў адукацыйных і выхаваўчых устаноў, якія пералічаны у п.3.4., устанаўліваецца адпаведнымі органамі адукацыі.

…

3.9. Зацверджаны і зарэгістраваны статут адукацыйнай і выхаваучай установы павінен быць пранумараваны, прашнураваны і змацаваны пячаткамі ўстановы і адпаведнага органа адукацыі, які зарэгістраваў статут.

3.10. Адзін экземпляр статута застаецца ў органе адукацыі, які зарэгістраваў статут.

3.11. У выпадку змяненняў, якія закранаюць арганізацыю і змест работы адукацыйнай і выхаваўчай установы, у статуце павінны быць зроблены адпаведныя запісы.

Запісы аб змяненнях і дапаўненнях у статут змяшчаюцца на адведзеных у канцы статута аркушах …

У выпадку рэарганізацыі ўстановы або змены ўласніка статут падлягае перарэгістрацыі.

Парадак унясення змяненняў і дапаўненняў, а таксама перарэгістрацыі адпавядае парадку рэгістрацыі статутаў.

## Прагнозы на будучыню

Разгледжаныя намі органы школьнага самакіравання дзейнічаюць на падставе ўжо агучаных напачатку законаў Рэспублікі Беларусь і іншых нарматыўных актаў. Тым не менш у перспектыве чакаецца прыняцце двух не менш важных: Закона Рэспублікі Беларусь "Аб агульнай сярэдняй адукацыі" і Кодэкса Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі".

Калі паглядзець на змены, ўжо ўнесеныя ў заканадаўчыя акты адносна школьнага самакіравання, то можна адзначыць, што прыняты накірунак развіцця не надае аптымізму. Параўнаем напісанае ў прыкладным Палажэнні аб агульнаадукацыйнай школе: "Дзяржаўна–грамадскае ўпраўленне школай ажыццяўляецца на аснове цеснага ўзаемадзеяння педагагічнага калектыву, вучняў, бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, і грамадскасці[42]. Вышэйшым органам кіравання школай з'ўляецца

[42] П. 28 "Прыкладнае палажэнне"

2.3.6. Структурныя падраздзяленні адукацыйнай і выхаваўчай установы і ўзаемаадносіны паміж імі.

2.3.7. Сістэма кіраўніцтва адукацыйнай і выхаваўчай установай (структура, парадак фарміравання, кампетэнцыя, арганізацыя дзейнасці).

2.3.8. Фінансаванне і гаспадарчая дзейнасць (у тым ліку ў частцы: фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння дзейнасці ўстановы, выкарыстання аб'ектаў уласнасці, якія замацаваны заснавальнікам за ўстановай, крыніц і парадку фарміравання ўласнасці, наяўнасці гаспадарчай або прадпрымальніцкай дзейнасці, наяўнасці платных адукацыйных паслуг і парадку іх прадстаўлення.

2.3.9. Рэквізіты рахункаў ва ўстановах банка.

2.3.10. Дакумент, якім рэгулююцца нормы і правілы ўнутранага працоўнага распарадку навучэнцаў, выхаванцаў і работнікаў установы.

2.3.11. Міжнародныя сувязі.

2.3.12. Формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, якія ўстаноўлены для адпаведных тыпаў адукацыйных і выхаваўчых устаноў, куды прадстаўляюцца.

2.3.13. Парадак рэарганізацыі і ліквідавання.

2.3.14. Акрамя гэтых пунктаў, у статут могуць уносіцца іншыя палажэнні, якія не супярэчаць закону і адлюстроўваюць асаблівасці дзейнасці ўстановы.

*3. **Распрацоўка, зацвярджэнне і рэгістрацыя статутаў***

3.1. Работа над праектам статута складаецца з некалькіх этапаў:

- падрыхтоўчы, у час якога ствараецца творчая група, вызначаюцца за кожным яе ўдзельнікам канкрэтныя абавязкі па распрацоўцы зместу праекта статута, тэрміны яе завяршэння і парадак абмеркавання праекта ў працоўным калектыве адукацыйнай і выхаваўчай установы;
- непасрэдная распрацоўка статута;
- абмеркаванне праекта статута ў працоўным калектыве;
- прыняцце, зацвярджэнне статута і прадстаўленне яго ў вызначаным парадку на рэгістрацыю.

3.2. Парадак зацвярджэння статутаў адукацыйных і выхаваўчых устаноў вызначаецца адпаведнымі Прыкладнымі палажэннямі аб гэтых установах[41] ці іншымі нарматыўнымі і заканадаўчымі дакументамі.

3.3. Вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя, вышэйшыя прафесіянальныя навучальныя ўстановы, ліцэі, гімназіі, рэспубліканскія ўстановы і арганізацыі сістэмы адукацыі незалежна ад іх падпарадкаванасці і формаў уласнасці рэгіструюць свае статуты ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.4. Агульнаадукацыйныя школы, прафесіянальна–тэхнічныя навучальныя ўстановы, дашкольныя і іншыя ўстановы сістэмы адукацыі ў залежнасці ад іх падпарадкавання мясцовым Саветам народных дэпутатаў

[41] У выпадку са школай – Прыкладным палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі



- на ацэнку сваёй вучэбнай і грамадскай дзейнасці;
- прадстаўляць школу ў конкурсах, алімпіядах, аглядах, спаборніцтвах і іншых мерапрыемствах у адпаведнасці са сваімі магчымасцямі;
- выбіраць і быць выбранымі ў органы вучнёўскага самакіравання і самакіравання ўстановы;
- прымаць удзел у размеркаванні зробленых установай грашовых сродкаў;
- на ўдзел у дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацыях (аб'яднаннях);
- на адтэрміноўку ад вайсковай службы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

Забараняецца прыцягненне навучэнцаў і выхаванцаў грамадскіх устаноў адукацыі без іх згоды і (або) без згоды іх законных прадстаўнікоў да працы, не прадугледжанай вучэбнымі планамі, вучэбнымі і выхаваўчымі праграмамі;

## *Абавязкі вучняў*[9]

Навучэнцы і выхаванцы абавязаны выконваць патрабаванні, прадугледжаныя заканадаўствам і статутам установы адукацыі:

- старанна вучыцца, авалодваць ведамі, практычнымі ўменнямі і навыкамі, быць дысцыплінаванымі, клапаціцца пра гонар класа, установы, падтрымліваць яе традыцыі;
- годна паводзіць сябе, праяўляць павагу да старэйшых і аднагодкаў, міласэрнасць, чалавечнасць;
- берагчы родную прыроду і навакольны свет, іх багацце і хараство;
- быць адказным за сваё здароўе і здароўе людзей вакол сябе;
- падпарадкоўвацца ўказанням і загадам дырэктара і яго намеснікаў, патрабаванням педагагічных работнікаў установы, рашэнням органаў самакіравання ўстановы і вучнёўскага самакіравання, выконваць статут установы.

Яшчэ раз хочацца нагадаць, што канкрэтныя правы і абавязкі, якімі надзеленыя настаўнікі, бацькі і вучні ў вашай школе, зафіксаваныя ў яе *статуце*. Часта, калі гэтаму нарматыўнаму дакументу не надаецца належнай увагі, ў ім проста пералічваюцца пункты з вышэйшых пастановаў і законаў. На самой жа справе статут школы – гэта добры шанец прапісаць прынцыпы супрацоўніцтва настаўнікаў, вучняў і бацькоў у межах канкрэтнай навучальнай установы.

[9] Арт. 48 "Аб адукацыі"; П. 77.2. "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"

# Хто кіруе школай

Кіраванне ў сферы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь носіць дзяржаўна–грамадскі характар і здзяйсняецца на падставе прынцыпаў галоснасці і дэмакратыі.

Дзяржаўнае кіраванне ў сферы адукацыі здзяйсняюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы ў адпаведнасці з паўнамоцтвамі, прадугледжанымі Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Ва ўстановах адукацыі ствараюцца органы самакіравання (саветы, апякунскія рады)[10].

Кіраванне школай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, яе статутам і будуецца на прынцыпах адзінаначалля і самакіравання[11].

Ва ўстанове могуць стварацца органы самакіравання: ***савет, апякунскі савет***, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннямі, што зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Ва ўстанове са згоды законных прадстаўнікоў вучняў могуць стварацца ***бацькоўскія камітэты***, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннем, што зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь[12].

Ва ўстановах ствараюцца (у пачатковых агульнаадукацыйных школах могуць стварацца) ***педагагічныя саветы***, асноўнымі задачамі якіх з'яўляюцца вызначэнне шляхоў рэалізацыі абранага зместу адукацыі (вучэбных планаў, праграм, падручнікаў і інш.) і павышэнне навукова-метадычнага ўзроўню педагагічных работнікаў[13].

***Кампетэнцыя і адказнасць школы[14]:***

Агульнаадукацыйная школа самастойна ў вырашэнні пытанняў арганізацыі адукацыйнага працэсу, здзяйсненні фінансава–гаспадарчай і іншай дзейнасці ў межах, вызначаных заканадаўствам, Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі і статутам дадзенай установы адукацыі.

[10] Арт. 44 "Аб адукацыі"
[11] П. 31 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[12] П. 31 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[13] П. 36 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[14] Арт. 45. "Аб адукацыі"



Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі і Прыкладным палажэннем аб статуце адукацыйнай і выхаваўчай установы распрацоўвае, а пасля ва ўстаноўленым парадку зацвярджае і рэгіструе свой статут.

У статуце школы абавязкова павінны прысутнічаць найменне (з указаннем формы ўласнасці), месца знаходжання, калі, кім (заснавальнік) створана, прадмет дзейнасці, кампетэнцыя заснавальніка, структура і парадак фармавання органаў кіравання і самакіравання, парадак назначэння кіраўніка, іх кампетэнцыя і арганізацыя дзейнасці, парадак кантролю за дзейнасцю ўстановы, парадак прадстаўлення заснавальніку справаздач пра паступленне і расход фінансавых і матэрыяльных сродкаў, парадак унясення зменаў і дапаўненняў у статут[39].

***2.3. Раздзелы статута[40]:***

2.3.1. Агульныя палажэнні (у тым ліку):

- статус;
- арганізацыйна–прававая форма адукацыйнай і выхаваўчай установы, указанне на тое, ці з'яўляецца яна юрыдычнай асобай;
- мэты і задачы дзейнасці;
- тыпы і віды адукацыйных праграм, якія рэалізуюцца.

2.3.2. Удзельнікі адукацыйна–выхаваўчага працэсу і адносіны паміж імі (у тым ліку):

- парадак прыёму навучэнцаў і выхаванцаў;
- правы і абавязкі навучэнцаў і выхаванцаў;
- парадак і падставы адлічэння;
- парадак камплектавання работнікамі;
- правы і абавязкі работнікаў;
- парадак рэгламентацыі і афармлення адносін установы з навучэнцамі і выхаванцамі і іх бацькамі (асобамі, якія іх замяняюць).

2.3.3. Арганізацыя адукацыйнага і выхаваўчага працэсу (у тым ліку):

- мова, на якой вядзецца навучанне і выхаванне;
- працягласць навучання і выхавання на кожным яго этапе (узроўні);
- сістэма адзнак пры прамежкавай і выніковай атэстацыі, яе формы, парадак;
- рэжым заняткаў.

2.3.4. Арганізацыя метадычнай і навуковай работы.

2.3.5. Правы і адказнасць адукацыйнай і выхаваўчай установы.

[39] На падставе Арт. 19 "Аб адукацыі", за выключэннем паўтораў з Прыкладным палажэннем аб статуце адукацыйнай і выхаваўчай установы
[40] Тут і ніжэй захавана нумарацыя Прыкладнага палажэння аб статуце адукацыйнай і выхаваўчай установы

- вядзенне ўліку паступлення і выдаткоўвання сродкаў апякунскага савета і падрыхтоўка справаздач аб іх выкарыстанні ў адпаведнасці з рашэннем агульнага сходу;
- каардынацыя сумесных намаганняў апякунскага савета, савета школы і адміністрацыі па дасягненню мэтаў, прадугледжаных статутам (П. 26.5);
- вырашэнне іншых пытанняў, акрамя тых, што адносяцца да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу.

Рашэнні кіраўніцтва, якія супярэчаць статуту школы і Палажэнню аб апякунскім савеце ўстановы адукацыі могуць быць аспрэчаны любым сябрам апякунскага савета, у тым ліку і праз суд.

***Старшыня кіраўніцтва апякунскага савета:***

- арганізуе працу і кіруе дзейнасцю кіраўніцтва, старшынствуе на пасяджэннях кіраўніцтва і агульнага сходу апякунскага савета;
- забяспечвае выкананне рашэнняў агульнага сходу, пасяджэнняў праўлення апякунскага савета;
- прадстаўляе апякунскі савет без даверанасці ва ўсіх узаемаадносінах з дзяржаўнымі, грамадскімі і іншымі арганізацыямі і фізічнымі асобамі па ўсіх пытаннях, якія датычаць апякунскага савета і яго інтарэсаў;
- вырашае іншыя пытанні, якія не адносяцца да кампетэнцыі агульнага сходу і кіраўніцтва апякунскага савета.

***Сакратар кіраўніцтва:***

- арганізуе правядзенне пасяджэнняў кіраўніцтва і агульных сходаў апякунскага савета;
- арганізуе вядзенне і захаванне пратаколаў пасяджэнняў кіраўніцтва і агульных сходаў апякунскага савета.

Дзейнасць апякунскага савета можа быць спынена па ініцыятыве агульнага сходу апякунскага савета і па ініцыятыве савета школы.

## Статут установы адукацыі

Як ужо было адзначана вышэй, кіраванне школай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, і яе статутам[38]. Статут установы адукацыі – гэта звод правілаў і палажэнняў, якія вызначаюць мэты, задачы, правы, арганізацыю, структуру і парадак яе дзейнасці ў сістэме адукацыі.

Кожная школа з улікам мясцовых сацыяльна-эканамічных, нацыянальных і рэгіянальных асаблівасцей, у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі", іншымі актамі заканадаўства,

[38] П. 31 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"



***Да кампетэнцыі школы адносяцца:***

- падбор, прыём і размеркаванне кадраў, павышэнне узроўню іх кваліфікацыі;
- здзяйсненне кантролю за выкананнем педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі сваіх абавязкаў;
- матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з дзяржаўнымі нарматывамі;
- прыцягненне для правядзення дзейнасці, прадугледжанай статутам школы, дадатковых фінансавых і матэрыяльных сродкаў шляхам, вызначаным заканадаўствам;
- арганізацыя і здзяйсненне метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу;
- распрацоўка і арганізацыя зацвярджэння вучэбных планаў і вучэбных праграм;
- здзяйсненне бягучага кантролю за паспяховасцю і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў школы, а таксама аналізу вынікаў адукацыйнага працэсу;
- здзяйсненне іншай дзейнасці, не забароненай заканадаўствам і прадугледжанай статутам дадзенай школы.

***Школа абавязана:***

- ажыццяўляць сваю дзейнасць у адпаведнасці з нормамі Закона Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі", нарматыўнымі актамі дзяржаўных органаў, якія рэгулююць адносіны ў галіне адукацыі;
- здзяйсняць адукацыйны працэс у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў, тыпавых вучэбных планаў і вучэбных праграм;
- садзейнічаць дзейнасці педагагічных і метадычных аб'яднанняў;
- садзейнічаць стварэнню ў школе неабходных умоў для працы падраздзяленняў установ грамадскага харчавання і аховы здароўя;

***Школа нясе адказнасць за:***

- невыкананне функцый, якія адносяцца да яе кампетэнцыі;
- неадпаведнасць якасці адукацыі вызначаным патрабаванням;
- дзеянні, якія прывялі да парушэння нормаў па ахове здароўя і бяспекі жыцця навучэнцаў і супрацоўнікаў школы, нормаў і правілаў аховы навакольнага асяроддзя пад час адукацыйнага працэсу;
- невыкананне нормаў санітарнага заканадаўства;
- парушэнне правоў і свабод навучэнцаў і супрацоўнікаў школы.

## *Дырэктар школы і яго намеснікі*

Непасрэднае кіраўніцтва навучальна-выхаваўчым працэсам і бягучай дзейнасцю ўстановы ажыццяўляюць дырэктар і яго намеснікі па навучальнай (навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай /у гімназіях

і ліцэях/, выхаваўчай) рабоце. Яны арганізуюць выкананне заканадаўства Рэспублікі Беларусь, рашэнняў дзяржаўных органаў кіравання адукацыяй і адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў[15].

Дырэктар і яго намеснікі па навучальнай (навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай, выхаваўчай) рабоце ўстановы прызначаюцца і вызваляюцца з займаемай пасады адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі[16].

Дырэктар установы нясе адказнасць за вынікі яе работы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. У межах сваёй кампетэнцыі дырэктар установы выдае загады і ўказанні, выкананне якіх з'яўляецца абавязковым для работнікаў і вучняў[17].

Дырэктар і яго намеснікі справаздачныя перад саветам школы. Апошні мае права ставіць перад органам адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа, пытанне аб вызваленні дырэктара і яго намеснікаў ад займаемых пасад і рэкамендаваць на гэтыя пасады тых або іншых педагагічных работнікаў[18].

***Дырэктар установы мае права:***

- размяркоўваць аб'ёмы педагагічнай, вучэбнай і арганізацыйна-выхаваўчай работы сярод педагагічных работнікаў;
- заключаць дамовы з арганізацыямі і фізічнымі асобамі на выкананне розных відаў работ (паслуг) з мэтай ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці ва ўстанове ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- абіраць і быць абраным у органы самакіравання.

Намеснік дырэктара па навучальнай (навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай) рабоце ажыццяўляе кіраўніцтва навучальна-выхаваўчай і метадычнай работай у адпаведнасці са службовымі абавязкамі намесніка дырэктара па асноўнай дзейнасці (навучальна-выхаваўчай рабоце) і намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце ўстановы, якія вызначаны ва ўстаноўленым парадку кваліфікацыйнай характарыстыкай.

Намеснік дырэктара па навучальнай (навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай) рабоце мае права абіраць і быць абраным у органы самакіравання[19].

---

[15] Арт. 46. "Аб адукацыі"; П. 32 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[16] Арт. 46. "Аб адукацыі"; П. 33 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[17] П. 34 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"
[18] П.29. "Аб статуце школы"
[19] П. 35 . "Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі"



Сяброўства ў апякунскім савеце спыняецца па ўласным жаданні праз пісьмовае інфармаванне кіраўніцтва апякунскага савета, а таксама шляхам выключэння на агульным сходзе апякунскага савета большасцю галасоў (неабходна ўзгадненне з саветам школы).

***Арганізацыйная структура***

Вышэйшым кіруючым органам апякунскага савета з'яўляецца агульны сход (праводзіцца не радзей чым 1 раз у палову года, пазачарговы сход можа быць скліканы па ініцыятыве кіраўніцтва або 1/3 сяброў). Кворум на сходзе складае больш ½ сяброў. Рашэнні па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі апякунскага савета прымаюцца большасцю галасоў прысутных.

***Да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу адносяцца:***

- выбранне новых сяброў кіраўніцтва і датэрміновае спыненне яго дзеяння;
- абранне і адкліканне старшыні кіраўніцтва;
- вызначэнне прыярытэтаў дзейнасці апякунскага савета і прыняцце рашэння аб яе ўдасканаленні, змена структуры і ліквідацыі апякунскага савета;
- вызначэнне прынцыпаў фармавання і выкарыстання фінансавых сродкаў ды іншай маёмасці апякунскага савета;
- разгляд і зацвярджэнне штогадовай справаздачы кіраўніцтва;
- падрыхтоўка прапановаў па ўдасканаленню дзейнасці школы;
- іншыя пытанні.

***Кіраўніцтва апякунскага савета***

Для арганізацыі бягучай дзейнасці абіраецца кіраўніцтва апякунскага савета. Тэрмін яго дзеяння, склад, норма прадстаўніцтва вызначаюцца агульным сходам апякунскага савета. Паседжанні праводзяцца па неабходнасці, кворум прыняцця рашэнняў – ½. Рашэнні прымаюцца простай большасцю ад прысутных. Кожны сябра кіраўніцтва мае адзін голас. Пры роўнай колькасці галасоў рашаючым з'яўляецца голас старшыні кіраўніцтва.

***Да кампетэнцыі кіраўніцтва адносяцца:***

- распрацоўка, прыняцце і арганізацыя рэалізацыі перспектыўных і бягучых планаў дзейнасці;
- арганізацыя выканання рашэнняў агульнага сходу апякунскага савета, здзяйсненне кантролю за рэалізацыя прапановаў і заўваг сяброў апякунскага савета;
- фармаванне павесткі дня і падрыхтоўка неабходных матэрыялаў для разгляду і прыняцця па іх рашэнняў на чарговым агульным сходзе, штогадовай справаздачы аб дзейнасці апякунскага савета;

адпачынку, выстаў, выстаў–распродажаў, спартыўна-масавых і іншых мерапрыемстваў;

- уносіць на разгляд савета школы прапановы аб зменах і дапаўненнях у яе статут, у тым ліку па спісе адукацыйных і іншых паслуг, якія робіць школа, па змесце ўмоў дамовы школы з бацькамі і (або) навучэнцамі ў частцы аказання дадатковых платных адукацыйных паслугаў;
- спрыяе арганізацыі паездак дзяцей з мэтай навучання і адпачынку, у тым ліку замежных;
- спрыяе ва ўсталяванні і развіцці міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне выхавання і адукацыі;
- разглядае іншыя пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі апякунскага савета статутам школы.

Апякунскі савет дзейнічае на падставе прынцыпаў добраахвотнага раўнапраўнага сяброўства, калегіяльнасці кіраўніцтва і галоснасці ў прыняцці рашэнняў. Рашэнне аб прыёмы новага сябра апякунскага савета прымаецца большасцю галасоў і зацвярджаецца рашэннем савета.

Рашэнні апякунскага савета па-за яго кампетэнцыяй носяць выключна дарадчы характар.

***Сябра апякунскага савета мае права[36]:***

- вылучаць, абіраць і быць абраным у кіраўніцтва апякунскага савета;
- абмяркоўваць, прапаноўваць, адстойваць свой пункт гледжання на сходах, пасяджэннях апякунскага савета, у друку, па усіх накірунках яго дзейнасці;
- атрымліваць інфармацыю, якая маецца ў распараджэнні апякунскага савета, здзяйсняць кантроль у вызначаным парадку;
- удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца апякунскім саветам, а таксам ў працы іншых грамадскіх аб'яднанняў школы, прынцыпы і дзейнасць якіх не супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

***Сябра апякунскай рады абавязаны[37]:***

- прызнаваць і выконваць патрабаванні Палажэння аб апякунскім савеце;
- прымаць удзел у дзейнасці апякунскага савета, прадугледжанай Палажэннем аб апякунскім савеце;
- выконваць рашэнні апякунскага савета, загады і распараджэнні школы;
- паважаць правы работнікаў школы і навучэнцаў;

[36] П. 16 "Апякунскі"
[37] П. 17 "Апякунскі"



## *Школьная канферэнцыя[20]*

Вышэйшым органам кіравання школай з'яўляецца канферэнцыя, якая праводзіцца не радзей аднаго разу ў год. Яна складаецца з дэлегатаў ад сходаў педагагічных работнікаў, вучняў II, III ступеняў і іх бацькоў (у малакамплектных школах можа быць заменена агульным сходам настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў)[21].

Канферэнцыя:

- абірае таемным галасаваннем савет школы, яго старшыню і намесніка[22];
- зацвярджае статут школы і ўносіць у яго неабходныя змены[23];
- вызначае асноўныя напрамкі развіцця школы,
- размяркоўвае бюджэтныя і дадатковыя фінансавыя сродкі на ўмацаванне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы[24];
- вызначае парадак арганізацыі навучальнага года (па чвэрцях, паўгоддзях ці трыместрах)[25];
- мае права перагледзіць або адмяніць рашэнне савета школы[26];
- разглядае спрэчныя пытанні паміж дырэктарам і саветам школы[27].

## *Савет школы*

Мэтай стварэння савета школы з'яўляецца развіццё дэмакратычных асноў кіравання, ініцыятывы школьнага калектыву і бацькоў, павышэнне іх уплыву на рашэнне арганізацыйна-педагагічных і іншых пытанняў функцыянавання і развіцця школы.

***1. Агульныя палажэнні[28]***

1.1. Савет школы, яго старшыня і намеснік старшыні выбіраюцца адкрытым або тайным галасаваннем на агульнашкольнай канферэнцыі педагагічных работнікаў, вучняў II, III ступеняў і іх бацькоў[29]. У перыяд

[20] На момант выпуску дадзенага дапаможніка яе праца агаворваецца толькі Прыкладным палажэннем аб савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь. Да гэтага асноўным нарматыўным актам, які разглядаў школьную канферэнцыю з'яўлялася прыкладнае палажэнне аб агульнаадукацыйнай школе. Улічваючы, што ў распрацоўках, пра якія будзе ісці гаворка ў раздзеле "Прагнозы на будучыню", дадзены орган школьнага самакіравання прысутнічае, мы падаем інфармацыю пра яго зыходзячы з абодвух нарматыўных актаў.
[21] П.29. "Прыкладнае палажэнне аб агульнаадукацыйнай школе"; П. 1.1. "Аб савеце"
[22] П. 1.1. "Аб савеце"
[23] П. 4. "Прыкладнае палажэнне"
[24] П. 1.6 "Аб савеце"; П. 29. "Прыкладнае палажэнне";
[25] П. 18. "Прыкладнае палажэнне"
[26] П. 1.4. "Аб савеце"
[27] П. 1.6 "Аб савеце"
[28] Нумарацыя пунктаў адпавядае Прыкладнаму палажэнню аб савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь
[29] У малакамплектных школах савет выбіраецца на агульным сходзе настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў

паміж канферэнцыямі савет выступае ў ролі вышэйшага органа самакіравання.

1.2. У склад савета школы ўваходзяць педагагічныя работнікі, вучні, бацькі (або асобы, якія іх замяняюць). Тэрмін паўнамоцтваў савета, яго колькасны склад, норма прадстаўніцтва кожнай катэгорыі (педагагічныя работнікі, вучні, бацькі) вызначаюцца канферэнцыяй. У выніку нездавальняючай дзейнасці савета канферэнцыя можа датэрмінова перавыбраць яго склад.

Савет школы збіраецца па неабходнасці. Члены савета школы выконваюць свае абавязкі на грамадскіх пачатках.

1.3. Рашэнні савета школы з'яўляюцца правамоцнымі, калі на яго пасяджэнні прысутнічала не менш за 2/3 савета і калі за іх прагаласавала не менш за 2/3 прысутных.

Рашэнні савета школы, якія прыняты ў межах яго паўнамоцтваў[30] і ў адпаведнасці з заканадаўствам, абавязковыя для выканання ўсімі членамі школьнага калектыву і бацькамі. Яны своечасова даводзяцца да іх ведама.

1.4. Рашэнне савета школы можа быць перагледжана або адменена канферэнцыяй, самім саветам пры паўторным яго разглядзе на пасяджэнні па патрабаванні дырэктара школы або аднаго з органаў самакіравання настаўнікаў, вучняў, бацькоў.

1.5. Член савета школы можа запатрабаваць абмеркавання прапанаванага ім пытання на пасяджэнні савета, калі яго прапанову падтрымае трэць членаў савета.

1.6. Дырэктар школы абавязаны адмяніць рашэнне савета, калі яно супярэчыць дзеючаму заканадаўству, Прыкладнаму палажэнню аб агульнаадукацыйнай школе Рэспублікі Беларусь ці статуту школы, а таксама мае права прыпыніць яго дзеянне ў выпадках, калі рашэнне супярэчыць вызначаным канферэнцыяй асноўным напрамкам развіцця школы або будзе адмоўна ўплываць на якасць навучальна-выхаваўчага працэсу, здароўе вучняў і членаў працоўнага калектыву. Спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць паміж саветам школы і дырэктарам, вырашаюцца на канферэнцыі школьнага калектыву або органам адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа.

### *2. Напрамкі дзейнасці савета школы*

2.1. Арганізуе выкананне рашэнняў канферэнцыі, ажыццяўляе кантроль за рэалізацыяй прапаноў і крытычных заўваг членаў школьнага калектыву і бацькоў вучняў.

Фарміруе павестку дня і рыхтуе неабходныя матэрыялы для разгляду на чарговай канферэнцыі, робіць справаздачу аб выніках сваёй дзейнасці.

[30] Арганізацыя навучальна-выхаваўчага працэсу ажыццяўляецца педагагічным саветам школы



паступленняў, не забароненых заканадаўствам. Яны залічваюцца на рахунак школы і выкарыстоўваюцца па мэтаваму прызначэнню ў адпаведнасці з рашэннем апякунскага савета. З выхадам сябра з апякунскага савета складкі і ахвяраванні не вяртаюцца.

Парадак стварэння і кампетэнцыя апякунскага савета вызначаюцца статутам школы.

Рашэнне аб стварэнні апякунскага савета прымае савет школы

***Функцыі апякунскага савета[35]:***

- распрацоўвае, прымае і арганізуе рэалізацыю планаў сваёй дзейнасці ў інтарэсах школы, а таксама ў інтарэсах арганізацый, якія ўваходзяць у дадзены савет;
- узаемадзейнічае з іншымі органамі самакіравання па пытаннях функцыянавання і развіцця школы. Старшыня апякунскага савета можа ўдзельнічаць у працы іншых органаў самакіравання школы з рашаючым голасам у адпаведнасці з яго паўнамоцтвамі пры разглядзе пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю апякунскага савета;
- садзейнічае школе ў здзяйсненні статутных функцый;
- аб'ядноўвае намаганні дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, асобных грамадзян, скіраваныя на ўмацаванне вучэбна–матэрыяльнай базы, ахову здароўя, развіццё здольнасцяў і талентаў навучэнцаў школы,
- стварэнне спрыяльных умоваў для выхавання, працы і адпачынку навучэнцаў, выкладчыкаў і іншых работнікаў;
- спрыяе забеспячэнню дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у кіраванні ўстановай адукацыі;
- распрацоўвае і рэалізуе планы сваёй дзейнасці ў інтарэсах школы і ў адпаведнасці з накірункамі працы;
- спрыяе прыцягненню пазабюджэтных сродкаў для забеспячэння і развіцця школы;
- спрыяе ўмацаванню і дасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы школы, добраўпарадкаванню яе памяшканняў і тэрыторыі;
- спрыяе арганізацыі і паляпшэнню ўмоваў працы педагагічных і іншых работнікаў школы, абароне і рэалізацыі законных правоў сябраў калектыву школы і апякунскага савета;
- вызначае накірункі, формы, памеры і парадак карыстання сродкамі апякунскага савета, у тым ліку на развіццё вучэбна-матэрыяльнай базы, на аказанне дапамогі дзецям з малазабяспечаных сямей, на падтрымку і стымуляванне таленавітых вучняў, а таксама здзяйсняе кантроль за іх мэтавым выкарыстаннем;
- спрыяе арганізацыі і правядзенню сацыяльна-культурных мерапрыемстваў: вучэбных канферэнцый, канцэртаў, вечароў

[35] П.10 "Апякунскі"

## *Вучнёўскае самакіраванне*

Трэцім і самым шматлікім удзельнікам навучальна-выхаваўчага працэсу ў школе з'яўляюцца вучні. Згодна з міжнародным заканадаўствам і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь яны маюць поўнае права на выказванне сваіх поглядаў і аб'яднанне дзеля дасягнення абраных імі мэтаў[33]. Пра ўдзел навучэнцаў у кіраванні школай сказана ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" (Арт. 48), а іх права выбіраць і быць абранымі ў органы вучнёўскага самакіравання і самакіравання ўстановы ў пункце 77.1 Палажэння аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі.

Трэба памятаць, што вучнёўскае самакіраванне з'яўляецца арганічнай часткай школьнага самакіравання і не можа быць падменена піянерскай, БРСМ або якой іншай арганізацыяй, бо іх мэты і задачы прынцыпова адрозніваюцца.

## *Апякунскі савет*

Дзеля таго, каб садзейнічаць забеспячэнню дзейнасці школы і яе развіццю ствараецца апякунскі савет. Яго дзейнасць агаворваецца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" (Арт. 44), Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі (П. 31) і Палажэннем аб апякунскім савеце. Паводле ўсіх гэтых нарматыўных актаў дадзены орган з'яўляецца натуральным складнікам школьнага самакіравання. Праўда, сэнс паняцця "самакіраванне"[34] разыходзіцца са зместам самога Палажэння аб апякунскім савеце, паводле якога "ў склад апякунскага савета могуць уваходзіць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, арганізацый розных формаў уласнасці, прадпрымальніцкіх і навуковых колаў, сродкаў масавай інфармацыі, грамадскіх аб'яднанняў і асацыяцый, у тым ліку і замежных, педагагічныя работнікі, навучэнцы і выхаванцы, іх бацькі, іншыя асобы, зацікаўленыя ў дасканаленні дзейнасці і развіцці ўстановы адукацыі" (П. 13). Сябрамі апякунскага савета могуць быць юрыдычныя асобы, якія дзейнічаюць праз сваіх прадстаўнікоў (П. 14).

### *Агульныя палажэнні*

Фінансавыя сродкі апякунскага савета фармуюцца з добраахвотных складак і ахвяраванняў ад фізічных і юрыдычных асоб, іншых

---

[33] Арт. 12.1, 13.1, 14.1, 15.1, 29.1 "Канвенцыя"; Арт. 2, 4, 33, 36 Канстытуцыі РБ; Арт 11, 26 "Аб правах"

[34] Напрыклад: Ожегов С.И. Словарь русского языка. 20-е изд. М., 1989. С.565 – "Самоуправление. 1. Право на внутреннее управление своими, местными силами. Студенческое С; с. городов. 2. Право решать дела внутреннего управления по собственным законом в пределах национально–территориальной единицы, автономии". Або: Коллектив. Личность. Общение: Словарь социально-психологических понятий / под. ред. Е.С. Кузьмина. Л., 1987. С. 94 – "Самоуправление – часть системы управления трудовым коллективом, в которой в качестве субъекта управления выступает сам коллектив".



2.2. Дапамагае адміністрацыі школы ў стварэнні адзінага дэмакратычнага творчага калектыву, умоў для рэалізацыі задач, якія стаяць перад школай.

Сумесна з адміністрацыяй школы забяспечвае аптымальнае спалучэнне дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у кіраванні, прыцягненне да кіравання педагогаў, вучняў і іх бацькоў, распрацоўку, прынячце і рэалізацыю ўнутрышкольных дакументаў, якія рэгламентуюць распарадак функцыянавання школы, органаў самакіравання, правы і абавязкі членаў калектыву.

2.3. Уносіць сумесна з адміністрацыяй і педагагічным саветам школы ў орган адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа, прапановы аб напрамках дыферэнцыяцыі ў навучанні, выхаванні і профілях працоўнай падрыхтоўкі вучняў, іх удзеле ў грамадска-карыснай працы, працоўных і кааператыўных аб'яднаннях, узаемадзеянні з сям'ёй.

2.4. Устанаўлівае сумесна з адміністрацыяй і педагагічным саветам рэжым работы школы, неабходнасць вучнёўскай формы і яе выгляд, вызначае па ўзгадненні з органам адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа, тэрміны правядзення канікулаў, працягласць працоўнага тыдня.

Стварае канфліктныя камісіі ў выпадках нязгоды вучняў ці іх бацькоў з гадавымі адзнакамі.

2.5. Прымае ўдзел у стварэнні камісіі па правядзенні атэстацыі педагагічных работнікаў і камісіі па працоўных спрэчках. У асобных выпадках ставіць пытанне перад адміністрацыяй школы або органам адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа, аб пераглядзе расстаноўкі педагагічных і іншых работнікаў.

2.6. Падтрымлівае ініцыятывы і меры, накіраваныя на ўдасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу, творчыя пошукі і даследчыцка–эксперыментальную работу педагогаў. Сумесна з адміністрацыяй вызначае шляхі ўзаемадзеяння школы з прафесіянальна-тэхнічнымі вучылішчамі, сярэднімі спецыяльнымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, з навукова-даследчымі ўстановамі, з вытворчымі і кааператыўнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі, добраахвотнымі таварыствамі, аддзяленнямі творчых саюзаў, з іншымі грамадскімі і дзяржаўнымі інстытутамі з мэтай стварэння неабходных умоў для рознабаковага развіцця вучняў і творчай дзейнасці педагогаў.

2.7. Вывучае, выпрацоўвае і сумесна з адміністрацыяй рэалізуе сістэму мер, накіраваных на ўмацаванне вучэбна–матэрыяльнай базы школы, стварэнне ўмоў для ўдасканалення пазакласнай выхаваўчай работы, па развіцці здольнасцей і схільнасцей дзяцей.

2.8. Прадстаўляе сумесна з адміністрацыяй, прафсаюзным камітэтам інтарэсы школы і членаў школьнага калектыву ў дзяржаўных органах і грамадскіх арганізацыях, ажыццяўляе меры па сацыяльнай абароне работнікаў школы і вучняў. Уносіць прапановы адміністрацыі аб заахвочванні і ўзнагароджанні вучняў, педагагічных і іншых работнікаў.

2.9. Заслухоўвае справаздачы аб рабоце дырэктара школы і яго намеснікаў. У неабходных выпадках уносіць на разгляд канферэнцыі школы прапановы па ўдасканаленні кіравання школай. Савет школы мае права ставіць перад органам адукацыі, якому непасрэдна падпарадкавана школа, пытанне аб вызваленні дырэктара і яго намеснікаў ад займаемых пасад і рэкамендаваць на гэтыя пасады тых або іншых педагагічных работнікаў.

2.10. Кантралюе расходаванне бюджэтных асігнаванняў, сумесна з адміністрацыяй школы вядзе работу па прыцягненні дадатковых фінансавых і матэрыяльных сродкаў, выкарыстоўваючы разнастайныя крыніцы іх паступлення.

## *Педсавет*

Педагагічны савет з'яўляецца пастаянна дзеючым органам школы. Ён ствараецца ва ўсіх агульнаадукацыйных школах, дзе працуе больш за тры настаўнікі. У сваёй дзейнасці педагагічны савет кіруецца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", Палажэннем аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі і Палажэннем аб педагагічным савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь.

***I. Задачы педагагічнага савета*** [31]

Галоўнымі задачамі педагагічнага савета з'яўляюцца:

- ➢ вызначэнне шляхоў рэалізацыі абранага зместу адукацыі (вучэбных планаў, праграм і г. д.);
- ➢ мабілізацыя намаганняў педагагічнага калектыву на павышэнне ўзроўню навучальна-выхаваўчага працэсу, задавальненне нацыянальна-культурных патрабаванняў вучняў, развіццё іх здольнасцей і інтарэсаў;
- ➢ павышэнне навукова-педагагічнай кваліфікацыі настаўнікаў і выхавальнікаў, развіццё іх творчых ініцыятыў;
- ➢ укараненне ў практыку дасягненняў педагагічнай навукі і перадавога педагагічнага вопыту.

***II. Змест работы педагагічнага савета***

У адпаведнасці з ускладзенымі на яго задачамі педагагічны савет вырашае наступныя пытанні:

- ➢ разглядае і зацвярджае планы работы школы і савета;
- ➢ вызначае па ўзгадненню з гарадскімі (раённымі) аддзеламі адукацыі працягласць навучальнага тыдня з улікам віду школы, варыянта навучальнага плана, умоў працы, санітарна-гігіенічных правілаў і нормаў;

[31] Нумарацыя частак захавана ў адпаведнасці з Палажэннем аб педагагічным савеце агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь



11. У выпадку нязгоды дырэктара школы з думкай большасці бацькоўскага камітэта спрэчнае пытанне вырашаецца раённым (гарадскім) аддзелам народнай асветы.

12. Аддзелы народнай асветы пры інспектаванні школы знаёмяцца з работай бацькоўскага камітэта і прымаюць меры да павышэння эфектыўнасці яго дзейнасці.

13. Бацькоўскія камітэты вядуць пратаколы сваіх пасяджэнняў і бацькоўскіх сходаў, якія захоўваюцца ў справах школы.

***3. Правы бацькоўскіх камітэтаў***

14. Бацькоўскі камітэт школы мае права:

- ➢ устанаўліваць сувязі з органамі дзяржаўнага кіравання, грамадскімі арганізацыямі, прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі і ўстановамі, якія шэфствуюць над школай, па пытаннях аказання дапамогі школе ў правядзенні выхаваўчай работы, умацавання яе вучэбна–матэрыяльнай базы, а таксама аб адносінах бацькоў да выхавання дзяцей;
- ➢ уносіць на разгляд дырэктара і педагагічнага савета школы прапановы па пазашкольнай і пазакласнай рабоце з вучнямі, па арганізацыйна-гаспадарчых пытаннях, па паляпшэнні работы педагагічнага калектыву з бацькамі вучняў. Дырэктар школы і педагагічны савет абавязаны ўважліва разглядаць прапановы бацькоўскага камітэта і паведамляць яму аб прынятых рашэннях;
- ➢ заслухоўваць паведамленні дырэктара школы аб стане і перспектывах работы школы і яго тлумачэнні па пытаннях, якія цікавяць бацькоў;
- ➢ заслухоўваць справаздачы класных бацькоўскіх камітэтаў і прымаць рашэнні па паляпшэнні іх работы;
- ➢ склікаць бацькоўскія сходы і канферэнцыі;
- ➢ прымаць удзел у стварэнні фонду ўсенавуча і вырашэнні пытанняў аб аказанні матэрыяльнай дапамогі вучням, якія маюць ў ёй патрэбу;
- ➢ прыцягваць бацькоў да ўдзелу ў розных формах ідэйна-палітычнага выхавання вучняў, грамадска-карыснай дзейнасці дзяцей, рабоце па прафесіянальнай арыентацыі, кіраўніцтве гурткамі і іншымі відамі пазакласнай і пазашкольнай работы;
- ➢ арганізоўваць дзяжурствы бацькоў у школе і ў мікрараёне школы.

15. Класныя бацькоўскія камітэты маюць права ўносіць прапановы класнаму кіраўніку па паляпшэнні пазакласнай работы з вучнямі, бацькамі вучняў класа і заслухоўваць растлумачэнні класнага кіраўніка па пытаннях, якія цікавяць бацькоў.

16. Старшыня агульнашкольнага бацькоўскага камітэта з'яўляецца членам педагагічнага савета школы.

- у ажыццяўленні абавязковага васьмігадовага навучання і пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі;
- у стварэнні інтэрнатаў пры школах і забеспячэнні ў іх належных бытавых умоў;
- у арганізацыі харчавання школьнікаў;
- у стварэнні і выкарыстанні фонду ўсенавуча;
- у стварэнні неабходнай матэрыяльнай базы для працоўнага навучання і выхавання;
- у прыцягненні бацькоў да непасрэднага ўдзелу ў выхаваўчай рабоце з вучнямі ў пазаўрочны час;
- у рабоце па прафесіянальнай арыентацыі вучняў;
- у ажыццяўленні кантролю за выкананнем школьнікамі "Правілаў для вучняў";
- у арганізацыі і правядзенні сходаў, дакладаў, лекцый для бацькоў, гутарак па абмене вопытам сямейнага выхавання;
- у ажыццяўленні мерапрыемстваў па ўмацаванні гаспадарчай і вучэбна-матэрыяльнай базы школы, добраўпарадкаванні і стварэнні ў ёй нармальных санітарна-гігіенічных умоў;
- у правядзенні аздараўленчай і культурна-масавай работы з вучнямі ў перыяд канікулаў.

7. Бацькоўскі камітэт школы і класныя бацькоўскія камітэты кіруюцца ў сваёй рабоце дадзеным Палажэннем, рэкамендацыямі дырэктара школы і педагагічнага савета, планам работы школы і пастановамі бацькоўскіх сходаў.

Бацькоўскі камітэт складае план работы на паўгоддзе або на год. Яго канкрэтны змест вызначаецца з улікам мясцовых умоў і задач, якія стаяць перад дадзенай школай.

8. Бацькоўскі камітэт школы, яго прэзідыўм і класныя бацькоўскія камітэты маюць права прымаць свае рашэнні пры наяўнасці на пасяджэнні не менш 2/3 яго членаў.

9. Для абмеркавання і вырашэння найбольш важных пытанняў бацькоўскі камітэт школы склікае сходы або канферэнцыі бацькоў (класныя – не радзей 4 разоў у год, агульнашкольныя – не радзей 2 разоў у год). Колькасць дэлегатаў на канферэнцыю ад кожнага класа ўстанаўліваецца бацькоўскім камітэтам школы.

На класных бацькоўскіх сходах абавязкова павінен прысутнічаць класны кіраўнік, на агульнашкольных – дырэктар школы, класныя кіраўнікі і настаўнікі.

***Заўвага.*** У сельскіх сярэдніх школах з вялікім раёнам абслугоўвання праводзяцца бацькоўскія канферэнцыі, дэлегаты на іх выбіраюцца на бацькоўскіх сходах на месцы жыхарства вучняў.

10. Бацькоўскі камітэт школы робіць справаздачу аб сваёй рабоце перад агульнашкольным бацькоўскім сходам (канферэнцыяй), а класны камітэт - перад класным бацькоўскім сходам у дзень выбараў новага складу камітэта.



- вызначае шляхі дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу;
- вырашае пытанні пераводу, арганізацыі экзаменаў і выпуску вучняў, іх узнагароджання і вызвалення ад здачы экзаменаў;
- накіроўвае вучняў у выпадку неабходнасці на медыка-педагагічную камісію ці псіхолага-педагагічную кансультацыю для вырашэння пытанняў аб выбару тыпу школы, у якой яны могуць працягваць навучанне;
- вызначае неабходнасць навучання, формы і тэрміны атэстацыі вучняў па індывідуальных планах;
- распрацоўвае правілы правядзення пераводных экзаменаў ці залікаў у выпадку, калі прымае адпаведнае рашэнне;
- стварае канфліктныя камісіі ў выпадках нязгоды вучняў ці іх бацькоў з гадавымі адзнакамі;
- дае згоду на выключэнне вучняў са школы, калі іншыя меры педагагічнага ўздзеяння вычарпаны;
- прымае рашэнне аб правядзенні эксперыментальнай работы па ўсіх напрамках дзейнасці, за выключэннем абавязковага кампанента зместу адукацыі;
- уносіць прапановы пры атэстацыі аб прысваенні настаўнікам кваліфікацыйных катэгорый.

На пасяджэннях педагагічнага савета могуць заслухоўвацца пытанні арганізацыі і якасці навучальна-выхаваўчага працэсу, стану выкладання асобных прадметаў, інфармацыі, справаздачы, паведамленні дырэктара, яго намеснікаў і супрацоўнікаў, прадстаўнікоў прадпрыемстваў, пазашкольных устаноў, праваахоўных органаў, медыцынскіх, грамадскіх і іншых арганізацый па розных напрамках дзейнасці школы. Кожнае пасяджэнне педагагічнага савета пачынаецца, як правіла, з інфармацыі адказных асоб або дырэктара аб выкананні папярэдніх рашэнняў ці даручэнняў.

### *III. Склад педагагічнага савета і арганізацыя яго дзейнасці*

У склад педагагічнага савета ўваходзяць: дырэктар школы (старшыня), яго намеснікі, настаўнікі, выхавальнікі, бібліятэкар, старшая піянерважатая.

Члены педагагічнага савета маюць права ў межах кампетэнцыі савета ўносіць на разгляд савета пытанні, звязаныя з удасканаленнем работы школы.

У неабходных выпадках на пасяджэнні педсавета запрашаюцца старшыня і члены савета школы, медыцынскія работнікі, прадстаўнікі прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый, вучні, іх бацькі і іншыя асобы. Усе запрошаныя карыстаюцца правам дарадчага голасу.

Педагагічны савет выбірае з свайго складу сакратара тэрмінам на адзін год.

Педагагічны савет працуе па плану, які зацвярджаецца саветам на кожны навучальны год. У выпадках неабходнасці могуць праводзіцца пазапланавыя пасяджэнні.

Рашэнні педагагічнага савета прымаюцца простай большасцю галасоў пры наяўнасці 2/3 яго членаў. Пры роўнай колькасці галасоў рашаючым з'яўляецца голас старшыні савета (дырэктара школы). Рашэнні педагагічнага савета аб выключэнні вучняў са школы прымаюцца па ўзгадненню з саветам школы і камісіяй па справах непаўналетніх у прысутнасці вучняў, іх бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць. Выпіска з рашэння разам з характарыстыкай выключанага вучня, зацверджанай педагагічным саветам, прадстаўляецца ў гарадскую (раённую) камісію па справах непаўналетніх для вырашэння пытання аб накіраванні вучня ў іншыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы ці яго працаўладкаванне. Арганізацыю дзейнасці па выкананню рашэнняў і рэкамендацый педагагічнага савета ажыццяўляе дырэктар школы. У выпадках нязгоды з рашэннем савета ён прыпыняе правядзенне рашэння ў жыццё і выносіць вырашэнне дадзенага пытання на разгляд савета школы ці гарадскога (раённага) аддзела адукацыі.

На пасяджэннях педагагічнага савета вядзецца пратакол, дзе фіксуецца ход абмеркавання пытанняў, якія вынесены на педагагічны савет, прапановы і заўвагі яго членаў і адпаведнае рашэнне. Пратакольна афармляюцца вынікі работы школы па асобных пытаннях навучальна-выхаваўчага працэсу за чвэрць (паўгоддзе, трыместр), навучальны год і рашэнні, прынятыя педагагічным саветам. Кожны пратакол падпісваецца старшынёй і сакратаром педагагічнага савета.

Кніга пратаколаў педагагічнага савета нумаруецца, прашнуроўваецца, змацоўваецца подпісам дырэктара і пячаткай школы. Нумарацыя пратаколаў аднаўляецца з пачатку кожнага навучальнага года. Поруч з пратаколамі педсавета могуць быць дадаткі да яго з дакладамі і выступленнямі, якія не ўвайшлі ў пратакол, з паметкай: "Даклад (выступленне) дадаецца".

Кніга пратаколаў захоўваецца ў справах школы ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб вядзенні школьнай дакументацыі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## *Бацькоўскі камітэт*

Бацькі, зацікаўленыя ў выніках навучальна-выхаваўчага працэсу, могуць аб'ядноўвацца ў бацькоўскія арганізацыі. Гэтае права прапісана ў Законе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Палажэнні аб установе, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі. Рэгулюе дзейнасць бацькоўскага камітэта Палажэнне аб бацькоўскім камітэце агульнаадукацыйнай школы і статут школы.



***I. Задачы бацькоўскіх камітэтаў*[32]**

1. Бацькоўскія камітэты ствараюцца, каб садзейнічаць школе ў ажыццяўленні выхавання і навучання дзяцей. Задачамі бацькоўскіх камітэтаў з'яўляюцца:

- усебаковае ўмацаванне сувязі паміж сям'ёй і школай з мэтай устанаўлення адзінства выхаваўчага ўплыву на дзяцей педагагічнага калектыву і сям'і;
- прыцягненне бацькоўскай грамадскасці да актыўнага ўдзелу ў жыцці школы, да арганізацыі пазакласнай і пазашкольнай работы;
- дапамога школе ў ажыццяўленні абавязковай васьмігадовай і ўсеагульнай сярэдняй адукацыі;
- удзел у арганізацыі шырокай педагагічнай прапаганды сярод бацькоў і насельніцтва;
- дапамога ва ўмацаванні гаспадарчай і вучэбна-матэрыяльнай базы школы.

***II. Арганізацыя і змест работы бацькоўскіх камітэтаў***

2. Бацькоўскі камітэт школы выбіраецца агульнашкольным бацькоўскім сходам або канферэнцыяй у пачатку кожнага навучальнага або каляндарнага года тэрмінам на адзін год. Колькасць яго членаў устанаўліваецца рашэннем агульнага сходу (канферэнцыі) бацькоў у залежнасці ад умоў работы школы.

3. Для выканання бягучай работы бацькоўскі камітэт школы выбірае са свайго складу:

- у сярэдніх і буйных васьмігадовых школах прэзідыум у складзе старшыні, намесніка, сакратара і 3-5 членаў прэзідыума;
- у невялікіх васьмігадовых і пачатковых школах старшыню, яго намесніка і сакратара;
- у аднакамплектных і двухкамплектных пачатковых школах - старшыню.

4. Бацькоўскі камітэт класа выбіраецца агульным сходам бацькоў класа ў складзе старшыні і 2-4 членаў.

5. Пад кіраўніцтвам членаў агульнашкольнага бацькоўскага камітэта ў кожнай школе могуць стварацца пастаянныя або часовыя камісіі па асобных раздзелах работы (па ажыццяўленні ўсеагульнага навучання, правядзенні педагагічнай прапаганды, па працоўным выхаванні і арганізацыі грамадска-карыснай працы школьнікаў, па культурна-масавай рабоце, гаспадарчай, спартыўна-аздараўленчай і інш.). Склад камісій і змест іх работы вызначаюцца бацькоўскім камітэтам.

6. Бацькоўскі камітэт арганізуе дапамогу школе:

- ва ўмацаванні сувязі педагагічнага калектыву з бацькамі вучняў і грамадскасцю;

[32] Нумарацыя частак і пунктаў згодна з Палажэннем аб бацькоўскім камітэце агульнаадукацыйнай школы